УДК 811.161.3’276.6.62

# Структурна-граматычная характарыстыка полікампанентных ваенных тэрмінаў

Савіцкая І.У., Гаўрош Н.В.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Полікампанентныя тэрміны надзвычай шырока выкарыстоўваюцца ў ваеннай тэрміналогіі. Найбольш прадуктыўныя – двухкампанентныя найменні, сярод якіх вылучаюцца: 1. Тэрміны з прэпазіцыйным азначэннем пры назоўніку. Азначэнне ў такіх тэрмінаадзінках можа выражацца простым прыметнікам (*ствольная каробка, рэактыўны снарад),* складаным суцэльнааформленым прыметнікам (*супрацьтанкавая артылерыя, самаходная гармата)*, складаным дэфіснааформленым прыметнікам (*аператыўна-тактычная падрыхтоўка, мінна-ўзрыўныя загароды).* Галоўным кампанентам выступае вытворны або невытворны назоўнік. 2. Тэрміны з постпазіцыйным азначэннем, выражаным назоўнікам: *атрад загароды, паласа агню, зона назірання.*

Прадуктыўныя ў ваеннай тэрміналогіі і трохкампанентныя адзінкі, сярод якіх пераважаюць тэрміны з прэпазіцыйным азначэннем-прыметнікам. Яны складаюцца з простага словазлучэння і залежнага ад яго асобнага слова: *індывідуальны процііхімічны пакет, палявы армейскі склад; тактычная глыбіня абароны.* У іх простае словазлучэнне выражана спалучэннем прыметніка з назоўнікам або спалучэннем двух назоўнікаў.

Радзей сустракаюцца трохкампанентныя тэрміны з постпазіцыйным двухчленным азначэннем пры назоўніку: *раён баявых дзеянняў, радыус суцэльнага паражэння; табліца сігналаў узаемадзеяння, раён збору войск.* У такіх састаўных тэрмінах азначэнне выражана спалучэннем прыметніка з назоўнікам або спалучэннем двух назоўнікаў.

Сярод чатырохкампанентных ваенных тэрмінаў пераважаюць адзінкі з прэпазіцыйным адначленным азначэннем пры трохкампанентным словазлучэнні: *плоская зона зенітнага агню, смяротная канцэнтрацыя атрутных рэчываў, індывідуальныя сродкі процііхімічнай абароны.*

Тэрміны-словазлучэнні, якія складаюцца з пяці і больш кампанентаў, у ваеннай тэрміналогіі ўжываюцца спарадычна. Паводле будовы яны ўяўляюць сабой больш складаныя ўтварэнні на базе двух- і трохчленных апорных словазлучэнняў: *прыбор кіравання артылерыйскім зенітным агнём, практычная найбольшая вышыня пад'ёму самалёта.*

Многія полікампанентныя ваенныя тэрміны спрашчаюцца, утвараючы складаныя словы (*авіяцыйная бомба – авіябомба, маскіровачны халат – маскхалат*) або абрэвіятуры (*паветрана-дэсантныя войскі – ПДВ, палкавая артылерыйская група – ПАГ, рэактыўны снарад – РС*).